# КАРАЛЬ РУМЕЛЬ — НАШ ПЕРШЫ АЛІМПІЕЦ

## За якія краіны выступаў беларус і як ён стаў часткай вялікай спартыўнай гісторыі

**Караль Румель нарадзіўся ў маі 1888 года ў Гродне, дакументы сведчаць, што яго сям'я жыла ў доме на Манастырскай вуліцы. Бацька — генерал расійскай арміі Альфонс Румель — пасадзіў сына ў сядло ў зусім малым узросце — 6 гадоў. Але, маркуючы па звестках, маленькі Караль развіваўся не толькі фізічна. Пазней ён скончыў мясцовую гімназію, а потым і Акадэмію мастацтваў у Пецярбургу.**



Караль Румель служыў у расійскай арміі і менавіта ў горадзе на Няве ўсур'ёз захапіўся конным спортам. Яго поспехі былі высока ацэнены членамі царскай сям'і, якія якраз і курыравалі гэты від спорту. Таму напярэдадні Алімпійскіх гульняў 1912 года гарадзенца запрасілі ў алімпійскую каманду Расійскай імперыі.

У Стакгольм, дзе праходзіла Алімпіяда-1912, каманда адпраўлялася не малым, па тых мерках, складам — больш за 150 чалавек. Караль Румель, які ўдзельнічаў у спаборніцтвах па пераадоленні перашкод на кані, першапачаткова лічыўся прэтэндэнтам на медаль.

Амаль усю дыстанцыю ён праходзіў бліскуча, апраўдваў чаканні і знаходзіўся сярод лідараў, але ўжо практычна на фінішы нашага спартсмена чакала сапраўдная трагедыя. На апошняй перашкодзе яго конь па мянушцы Зяблік зачапіў бар'ер і ўпаў, прыціснуўшы сабой наезніка Румеля. Амаль губляючы прытомнасць ад нясцерпнага болю, Караль усё ж учапіўся ў аброць, узлез на каня і, прыціскаючы руку да грудзей, накіраваўся да фінішу. Калі ён прайшоў дыстанцыю, то страціў прытомнасць. Як высветлілася потым, траўма была даволі сур'ёзнай — пералом пяці рэбраў.

За гэтай драматычнай сцэнай на іпадроме назіраў кароль Швецыі Густаў V, дарэчы, патрон Гульняў. Ён быў так уражаны трагедыяй конніка, што загадаў адліць яшчэ адзін залаты алімпійскі медаль, які Румелю ўручылі ўжо ў бальнічнай палаце. Гэта ўнікальны выпадак у гісторыі алімпійскага руху.

На Алімпіядзе ў Швецыі каманда Расійскай імперыі заваявала толькі чатыры медалі: два сярэбраныя і два бронзавыя, «золата» беларуса стала пятай і самай каштоўнай узнагародай у камандзе.

У 20-я гады мінулага стагоддзя, калі заходнебеларускія землі ўваходзілі ў склад Польшчы, ён яшчэ двойчы ўдзельнічаў у Алімпійскіх гульнях — у складзе польскай каманды. На Алімпіядзе-1924 у Парыжы ён выступіў у ролі трэнера яшчэ аднаго нашага славутага земляка — Адама Крулікевіча. Вучань Румеля, як і настаўнік, не застаўся на Гульнях без узнагарод: для зборнай Польшчы ён заваяваў бронзавы медаль. А на наступнай Алімпіядзе ў Амстэрдаме Караль зноў сам выйшаў на дыстанцыю і зноў паспяхова — у Галандыі ён стаў бронзавым прызёрам у трохбор'і (у камандным заліку).

Акрамя алімпійскіх турніраў Караль Румель шмат выступаў на іншых спаборніцтвах, у тым ліку перамог на прадстаўнічым турніры ў ЗША, які праходзіў на знакамітай арэне «Мэдысан Сквер Гардэн».

Неўзабаве пасля Алімпіяды-1928 афіцэр Войска Польскага Караль Румель пакінуў актыўныя заняткі конным спортам. Больш не ўдзельнічаў у спаборніцтвах і яго любімы конь Донес.

Калі пачалася Другая сусветная вайна, Караль — падпалкоўнік кавалерыі — пайшоў на фронт, паспеў праявіць сябе ў баях, але потым трапіў у палон і апынуўся ў канцлагеры. Прайшоў праз Дахау і Маўтхаўзен. Гэтыя падзеі значна падарвалі яго здароўе — кажуць, чарнавалосы ліхі коннік стаў проста непазнавальным.

Пасля вайны Караль Румель яшчэ займаўся трэнерскай дзейнасцю і падрыхтаваў нямала выдатных коннікаў. А 7 сакавіка 1967 года гісторыя першага беларускага алімпійца скончылася: ён памёр на семдзясят дзявятым годзе жыцця ў Сопаце.

# Футбол, вяселле, допінг

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра вынікі матчаў 18-га тура чэмпіянату краіны па футболе, вяселле Аляксандра Глеба і пра беларускага таэквандыста, які не едзе на Алімпійскія гульні.**

***1. Завяршыўся чарговы тур чэмпіянату Беларусі па футболе.*** Лідар першынства — барысаўскі БАТЭ — перамог «Мінск» — 3:1, такі ж лік зафіксаваны ў гульні яшчэ двух прэтэндэнтаў на месца ў прызавой тройцы — футбалісты салігорскага «Шахцёра» абыгралі ў гасцях мінскае «Дынама». Брэсцкія дынамаўцы ў сябе дома перайгралі бабруйскую «Белшыну» — 2:1. «Крумкачы» саступілі «Іслачы» — 0:1, а «Віцебск» і гродзенскі «Нёман» разышліся нічыёй — 1:1. У матчы «Граніту» (Мікашэвічы) і «Славіі» (Мазыр) галоў гледачы так і не бачылі — 0:0. «Нафтан» (Наваполацк) на сваім полі саступіў «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — 1:3. «Слуцк» і «Гарадзея» не змаглі выявіць пераможцу — 1:1.

Першы радок турнірнай табліцы па-ранейшаму ўтрымлівае барысаўскі БАТЭ, на другі вярнуўся салігорскі «Шахцёр», на трэцяй пазіцыі размясціўся «Іслач».

***2. У пятніцу лепшы беларускі футбаліст сучаснасці Аляксандр Глеб ажаніўся з Святланай Губарэвіч.*** Нагадаем, гэта другі шлюб спартсмена, першай яго жонкай была Анастасія Касянкова. Яны правялі разам сем гадоў, але два гады таму развяліся.



Цяперашняя жонка Глеба Святлана скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, затым — факультэт міжнародных эканамічных адносін БДЭУ, была салісткай ансамбля «Равеснік», перамагла ў конкурсе «Супермадэль Беларусі». Працавала спецыялістам па продажах у буйной кампаніі, дапамагала ў бізнесе бацьку. Потым разам са старэйшай сястрой адкрыла свой магазін адзення.

***3. Беларускі таэквандыст Арман-Маршал Сіла часова адхілены ад удзелу ў спаборніцтвах.*** Гэта практычна выключае яго ўдзел у Алімпіядзе-2016. Прычынай такога рашэння з'яўляецца наяўнасць у допінг-пробе спартсмена забароненага прэпарату мельдонія.

Доктар нацыянальнай каманды Вольга Жарко, сам Арман-Маршал Сіла і яго асабісты трэнер Юлія Сухавіцкая цалкам адмаўляюць ужыванне згаданага прэпарату.

Кіраўніцтва Беларускай федэрацыі таэквандо таксама ўпэўнена ў невінаватасці спартсмена і трэнера, бо гэты прэпарат не выкарыстоўваўся нават у перыяд, калі не ўваходзіў у спіс забароненых, пра што сведчаць вынікі аналізу трох допінг-проб спартсмена (яны былі здадзены ў студзені, лютым і красавіку 2016 года).

— Канчатковыя высновы можна будзе зрабіць толькі па выніках расследавання, — каменціруе сітуацыю намеснік старшыні БФТ Андрэй Чучвал. — Мы цвёрда ўпэўнены ў невінаватасці Армана-Маршала і будзем адстойваць гэтую праўду ўсімі магчымымі спосабамі.

Алімпійскі турнір па таэквандо пройдзе з 17 па 20 жніўня.

***4. Дзеючыя чэмпіёны Беларусі хакеісты мінскага «Юнацтва» дэбютуюць у хакейнай Лізе чэмпіёнаў сезона 2016/17.*** Сёння матч з чэшскім клубам «Млада Баляслаў» пройдзе на лёдзе «Чыжоўка-Арэны» і пачнецца ў 19.00. Далей у групе L папярэдняга раўнда 23 жніўня мінчане дома прымуць шведскі «Векшэ», шэрагі якога нядаўна папоўніў форвард зборнай Беларусі Джэф Плат.

У верасні «Юнацтва» правядзе выязныя матчы з тымі ж сапернікамі. 6 верасня беларуская каманда пазмагаецца з «Млада Баляславам», а 9 верасня — з «Векшэ». Каманды, якія занялі першае і другое месцы ў кожнай з 16 папярэдніх груп, атрымаюць права выступлення ў плэй-оф.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Першая...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Першую ўзнагароду ў скарбонку зборнай прынесла цяжкаатлетка Дар'я Навумава. Яна стала сярэбраным прызёрам у вагавай катэгорыі да 75 кг. Для 20-гадовай дзяўчыны з вёскі Патока Клічаўскага раёна гэта дэбютная Алімпіяда і адразу — поспех. Дарэчы, сусветныя СМІ яшчэ да старту Гульняў прадказвалі прарыў на Гульнях менавіта гэтай беларускі. Тады Дар'ю называлі галоўнай прэтэндэнткай на «золата» ў сваёй вагавой катэгорыі.

У рыўку Дар'я Навумава ў трэцяй спробе падняла штангу вагой 116 кг, а ў другім практыкаванні — штуршку — узяла 142 кг. Беларускую спартсменку абышла толькі прадстаўніца КНДР Лім Джон Сім, якая набрала ў суме дваяборʼя 274 кг (121 + 153).

*— Вядома, можна было падымаць і больш. Сярэбраны медаль — стымул трэніравацца далей. Я яшчэ абавязкова сустрэнуся з сапернiцай і абавязкова выйграю,* — кажа Дар'я пасля цырымоніі ўзнагароджання. — *Асабліва да Алімпіяды я не была гатова. Таму, калі зрабіла завяршальную спробу тут, у Рыа, то было толькі пачуццё радасці. Перад стартам старалася не забіваць галаву, што вось гэта будуць Алімпійскія гульні. Вырашыла для сябе, што гэта звычайны старт, што трэба рабіць тое, што і заўсёды.*

Цяжкай атлетыкай Дар'я Навумава стала займацца толькі ў 10-м класе, а да гэтага штурхала ядро і кідала дыск.

*— З-за майго невысокага росту было складана канкурыраваць з сапернiцамі. Таму паступіла ў Бабруйскае вучылішча алімпійскага рэзерву і стала займацца цяжкай атлетыкай. Трэнер потым жартаваў: маўляў, цяжкі снарад трэба штурхаць адной рукой, а штангу дзвюма рукамі — лягчэй,* — распавядае Даша.

Да алімпійскага «серабра» найлепшым вынікам Навумавай было 5-е месца на чэмпіянаце свету 2015 года, але, як запэўнівае трэнер спартсменкі Віктар Шаршукоў, «да наступнай летняй Алімпіяды ў Токіа Даша будзе падрыхтавана яшчэ лепш».

## Золата

Пасля першай узнагароды на Гульнях беларускія заўзятары ўздыхнулі з палёгкай: маўляў, пачатак пакладзены, далей справа мусіць пайсці куды хутчэй. Ужо на наступны дзень, суботнім вечарам, з Рыа прыйшла радасная навіна: Уладзіслаў Ганчароў стаў алімпійскім чэмпіёнам у скачках на батуце.

За дзень да гэтага ў скачках выступалі дзяўчаты — Тацццяна Пятрэня і Ганна Гарчанок — сумесь вопыту і маладосці. Але ні адна, ні другая з-за памылак не змагла падняцца на п'едэстал, хоць добрыя шанцы былі ў абедзвюх. Пятрэня — пятая, Гарчанок — восьмая.

А вось Уладзіслаў бліскуча правёў свой алімпійскі дэбют. У кваліфікацыі ён быў другім і ўпэўнена выйшаў у васьмёрку фіналістаў. Выступаючы перадапошнім, беларус ужо ведаў вынікі амаль усіх галоўных канкурэнтаў. Нягледзячы на гэта — у скачку не кроплі нервовасці, усё выразна, спакойна і галоўнае — «чыста». Атрымаўшы ад суддзяў 61,745 бала, Ганчароў выйшаў у лідары і чакаў скачка свайго адзінага саперніка — кітайскага спартсмена Гаа Лея, які ў выніку не змог перамагчы беларуса.

*— У дзень фіналу прачнуўся вельмі рана. Не буду хаваць, перажываў: усё ж такі вельмі важны момант у жыцці любога спартсмена,* — распавядае Уладзіслаў. *— У фінале набраў добрую суму балаў, гэта вельмі высокі вынік, і, вядома, я сабой задаволены. Перад стартам меркаваў, што буду ў прызёрах, але ніяк не мог увіць, што стану чэмпіёнам і ў мяне будзе залатая ўзнагарода. Усё ж такі канкурэнцыя ў нашым відзе спорту сур'ёзная: кітайцы, расіяне. Усё магло разгарнуцца ў адваротны бок.*

## Серабро

Яшчэ адну ўзнагароду ў цяжкай атлетыцы Беларусі прынёс Вадзім Стральцоў, які заняў другое месца ў катэгорыі да 94 кг. Спартсмен змог паказаць вынік 395 кг (175 + 220).

Стральцоў лічыўся фаварытам турніру ў сваёй вагавай катэгорыі, але выступленне не заладзілася з самага пачатку. У першым практыкаванні, рыўку, Вадзім выканаў толькі адну заліковую спробу — першую на 175 кг. Два наступныя выхады на памост сталі няўдалымі. Такая ж гісторыя паўтарылася і ў другім практыкаванні. Займаючы пасля рыўка толькі чацвёртае месца, беларус у штуршку пачаў з вагі ў 220 кг. Штанга яму скарылася, але далей дзве спробы на 230 кг, якія маглі вывесці нашага спартсмена на першае месца, сталі няўдалымі. У выніку — сярэбраны медаль.

*— Вельмі расчараваны,* — кажа Вадзім Стральцоў. *— У 2015 годзе штурхнуў тыя ж 230 кг, якія тут не ўзяў. Не ідзе рывок, і ўсё. Відаць, знак: патрэніруйся яшчэ гадкі чатыры. Нацэльваўся ў першую чаргу на вынік, таму і расчараваны з-за таго, што не дабраў сваё.*

## Бронза

Ужо трохі пазней, ноччу, узнагароду ў актыў беларускай зборнай прынесла наша «залатая рыбка» — Аляксандра Герасіменя. Яна заваявала «бронзу» на дыстанцыі 50 м вольным стылем. Вынік Аляксандры — 24,11 секунды, гэта новы рэкорд Беларусі. Чэмпіёнкай на гэтай дыстанцыі стала дацкая плыўчыха Перніле Блюм.

*— У апошні дзень алімпійскага турніру па плаванні, у апошні заплыў прыкпала максімум намагання. Улічваючы, як я пачынала выступаць у Рыа, бронзавы медаль бягучых Гульняў дастаўся значна цяжэй, чым дзве сярэбраныя ўзнагароды ў Лондане. Усё ж такі сабралася, адкінула ўсе негатыўныя думкі і выдала вынік,* — кажа Аляксандра. — *У камандзе плыўцоў абстаноўка была вельмі напружаная. Гэта моцна паўплывала на выступленне зборнай. Спадзяюся, што пасля Гульняў будуць правільна расстаўлены акцэнты і плаванне працягне развівацца далей.*

Нагадаем, на Алімпійскіх гульнях-2012 у Лондане Аляксандра Герасіменя была сярэбраным прызёрам у гэтай дысцыпліне з вынікам 24,28 секунды. Яшчэ адно «серабро» лонданскай Алімпіяды яна заваявала на стаметроўцы кролем.

## Не медаль, але дасягненне

Вольга Мазуронак заняла 5-е месца ў марафонскім забегу. Вынік спартсменкі на дыстанцыі 42 км 195 м — 2 гадзіны 24 хвіліны 48 секунд. Наўрад ці знакамітыя саперніцы чакалі такога прарыву ад беларускі. Роўна на сярэдзіне забегу Вольга вырвалася ў лідары і доўгі час задавала рытм. Але на апошніх кіламетрах нашу марафонку адцяснулі ад п'едэстала, сіл хапіла дабрацца толькі да 5-га месца.




*— Улічваючы гарачае надвор'е, каля 30 градусаў, адчувала сябе падчас бегу па дыстанцыі добра. Вынік па часе цалкам прыстойны па такім надвор'і. Што тычыцца 5-га месца, шмат хто кажа, што выдатна, але я расчаравана. Разумею, што ў вядучых бягунняў у марафоне выйграць надзвычай цяжка, аднак я адстала ад асноўнай групы толькі за некалькі кіламетраў да фінішу. Магу дадаць толькі адно: сумленне ў мяне чыстае, зрабіла ўсё, што ад мяне залежала,* — падзялілася пасля выступлення Вольга.

Адзначым, што ўсяго за перамогу змагаліся 159 лёгкаатлетак. Чэмпіёнкай Гульняў на самай працяглай беговай дыстанцыі стала Джэміма Джэлагат Сумгонг з Кеніі (2 гадзіны 24 хвіліны 4 секунды).